# Каранавірус, «Нафтан» і Канстытуцыя

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА правяла сустрэчу са студэнтамі і маладымі выкладчыкамі Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта.**

Наталля Качанава адзначыла, што шчыра рада быць у родным горадзе і ВНУ. Традыцыйна дэпутаты і сенатары сустракаюцца з працоўнымі калектывамі, выкладчыкамі, студэнтамі. Адной з узнятых тэм стала пандэмія. Спікер верхняй палаты парламента заклікала прысутных вакцынавацца і не верыць псеўданавуковым расповедам пра неэфектыўнасць вакцыны і яе небяспеку для здароўя.

«Вядома, сітуацыя сур'ёзная, вірус муціруе. Зараз больш хварэе моладзі, дзяцей і цяжарных — у першую хвалю такіх пацыентаў было менш. Каб змагацца з гэтай хваробай, трэба вакцынавацца — гэта выратаванне. У краінах, якія маюць працэнт прышчэпленых 70 і больш, сітуацыя паляпшаецца. Не разумею, чаму людзі сумняваюцца, ці трэба вакцынавацца», — сказала Наталля Качанава. Яна дадала, што сама перахварэла, адразу было дастаткова антыцелаў, але праз некаторы час прышчапілася. Пазней плануе вакцынавацца яшчэ раз.

Малады выкладчык ВНУ закрануў пытанне будучага рэферэндуму па Канстытуцыі, якія змены плануюць прапанаваць. У ліку выказаных ідэй на пасяджэнні камісіі — наданне канстытуцыйнага статусу Усебеларускаму народнаму сходу, увядзенне ўпаўнаважанага па правах чалавека, стварэнне адзінага дня галасавання — у пэўную дату будуць абраныя дэпутаты ўсіх узроўняў. «Раней ва УНС быў дарадчы статус, але цяпер плануецца змяніць гэта. Таксама ўсе падтрымліваюць, што павінна застацца прэзідэнцкая форма праўлення, яна сябе зарэкамендавала», — адзначыла Наталля Качанава.

Акрамя таго, па выніках рэферэндуму могуць быць пашыраныя паўнамоцтвы Канстытуцыйнага Суда, прапануецца павялічыць узрост кандыдатаў у прэзідэнты (40 гадоў замест 35), такі чалавек павінен пражыць у краіне не менш за 20 гадоў. Папярэдне ў Асноўным Законе падкарэкціравалі 54 артыкулы, прапісалі тэзісы пра моладзь, духоўна-маральнае выхаванне, гістарычную памяць, недапушчальнасць перапісвання гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, а таксама што шлюб — гэта саюз мужчыны і жанчыны.

Наталля Качанава заклікала маладых людзей крытычна ставіцца да інфармацыі, умець адрозніваць праўду ад хлусні і маніпуляцый. У гэтым важная роля СМІ, прысутнасці органаў улады ў інтэрнэце. «Суверэнітэт і незалежнасць, можа, не так складана атрымаць, як захаваць. У нашай краіне рэалізаваць сябе можа любы чалавек, таму Беларусь трэба захоўваць, развіваць. Нельга паддавацца эмоцыям і розным заклікам звонку, якія ідуць на развал краіны», — сказала яна студэнтам.

Закранулі ўдзельнікі дыялогу і развіццё Полацкага раёна, мадэрнізацыю важнага прадпрыемства ў рэгіёне — «Нафтана». «Удасканаленне завода неабходна. Напрыклад, зараз пабудавалі ўстаноўку запаволенага каксавання, некалькі разоў пераносіліся тэрміны яе запуску, што не вельмі добра. Мы разумеем важнасць работы завода і падтрымліваем яго», — расказала Наталля Качанава і дадала, што пасля нядаўняга пажару на прадпрыемстве працуе следства і высвятляе прычыны здарэння. Яна таксама падкрэсліла важнасць ПДУ ў падрыхтоўцы кадраў для «Нафтана».

Падчас сустрэчы таксама абмяркоўвалі важнасць заняткаў спортам, стварэнне беларускай крыптавалюты, супрацоўніцтва з дзяржавамі, развіццё IT-галіны і сферы адукацыі.

Падводзячы вынікі сустрэчы, Старшыня Савета Рэспублікі адзначыла, што дыялог атрымаўся і прайшоў у душэўнай атмасферы.

**Паводле БелТА.**